расположенный на расстоянии около 50 м от источника загрязнения (закрытые теплицы ТК «Берестье»), оказывается большое антропогенное воздействие, на пруд «Зеркалка», расположенный на расстоянии около 500 м от источника загрязнения, влияние с/х предприятия практически не ощущается. Таким образом, экологическое состояние водоемов зависит от степени эвтрофирования и удаленности от источника загрязнения грунтовых вод.

**Практическое применение полученных результатов.** Изучение экологического состояния водоемов открывает возможности практического решения многих задач по определению степени влияния сельскохозяйственного предприятия на водоемы, возможности их эксплуатации, а так же защиты окружающей среды от воздействия загрязняющих водные объекты веществ.

## УЯЎЛЕННЕ БЕЛАРУСАЎ ПРА РУСАЛКУ

*Л. А. Грыгарук (студэнт I курса)*

**Праблематыка.** Старажытны чалавек уяўляў, што ўсё вакол яго такое ж жывое, як і ён сам, што прырода таксама мае душу. Характэрна дзейснае ўспрыняцце наваколля. Апісанне падзей і іх тлумачэнне магло мысліцца толькі як дзеянне і па неабходнасці прымаць форму аповяду. Адным са значных вобразаў такіх дамінантных аповедзяў з’яўляецца русалка. Уяўленні пра гэта і сітуацыйныя і яе вобраз адлюстраваны таксама ў розных відах мастацтва.

**Мэта працы**. Вызначыць семантыку і функцыянальнасць вобраза русалкі ў беларускай традыцыйнай мадэлі свету. Вызначыць спецыфіку беларускіх уяўленняў пра генезіс русалак, высвятленне сувязі выявы русалкі з каляндаром, з абраднасцю "правадоў"; спроба супастаўляльнага вывучэння матэрыялаў павер'яў з дадзенымі абрадавымі "русальнымі" традыцыямі; сістэматызацыя малавывучаных звестак аб сувязі русалак з раслiннасцю; і нарэшце, уводзіны ў навуковы ужытак новых палявых матэрыялаў з зоны Палесся, якія збіраліся па адзінай праграмы і з улікам досыць густой сеткі даследуемых пунктаў.

**Аб'ект даследвання**. Зацікаўленне да русалкі як міфалагічнага персанажа: да яго вобраза, генезісам, сувяззю выявы русалкі з календаром, з абраднасцю “правадоў”, з раслiннасцю.

**Выкарыстаныя методыкі.** Сістэмны падыход, метад аналізу, метад класіфікацыі.

**Навуковаянавізна.** Быў сістематызаваны вобраз русалкі як міфалагічны персанаж у вераваннях беларусаў.

**Атрыманыя вынікі.** У выніку былі ахарактарызавана дэманалогія ў цэлым. Разгледжаны беларускія нячысцікі, такія як Сатана, Чорт, Люцыпар, Сатон, Анцыпар, Д’ябал. А таксама нячысцікі будынку сядзібнага комплексу: у хляве жыве хлеўнік, у доме – дамавік, у лазні – лазнік, на гумне – гуменнік, на пуні – пуннік, на полі – палявік, у лесе – лесавік (лешы), у самых глухіх гушчарах жыве пушчавік, ля вадаёмаў – вадзянікі, у балотах – балотнікі, багнікі, аржанікі, назвы якіх звязаныя з відам балота і г. д.

Былі акрэсленыя асноўныя функцыі русалак. У асноўны набор карысных і дрэнных дзеянняў, якія прыпісваюцца русалкам уваходзіць: палоханне,

праследаванне людзей, тапленне, зашмальцоўванне козытам, псаванне пасеваў і г. д. Па матэрыялах паўднёварускіх павер’яў, русалкі насыпаюць на палі буры, ліўні, град; там, дзе яны бегалі і гарэзавалі, трава расце гушчэй і зяляней, і там хлеб народзіцца багацей.

Быў разгледзены абрад “Правады русалкі”. У гэтым абрадзе русалку “палілі”, “тапілі”, “закупоўвалі” на могілках, “праганялі” і “хавалі”. Былі выяўлены формы і атрыбуты пераапранання, такія як вянкі і іншая зяляніна. Дзяўчаты апраналі белую вопратку або былі паўаголены, некаторых апраналі ва ўборы нявесты.

**Практычнае прымяненне атрыманых рэзультатаў.** Практычная значнасць працы заключаецца ў тым, што матэрыялы даследавання могуць быць выкарыстаны пры вывучэнні на занятках па міфалогіі ў ВНУ, а таксама пры падрыхтоўцы да факультатыўных заняткаў у ВНУ і школах, гімназіях, ліцэях.

## СЕМАНТЫКА-СТЫЛІСТЫЧНЫЯ АСАБЛІВАСЦІ ЧУЖОГА МАЎЛЕННЯ Ў “ПАЛЕСКАЙ ХРОНІЦЫ” І. МЕЛЕЖА

*К. П. Маслаў (студэнт I курса)*

**Праблематыка.** У беларускім мовазнаўстве распрацоўкай метадалогіі лінгвааналізу мастацкіх тэкстаў займаліся Ф. М. Янкоўскі, Т. М. Малажай, У. П. Лепешаў, М. В. Абабурка і многія іншыя, чые імёны вядомыя далёка за межамі краіны. Аднак вывучэнне мастацкіх твораў вельмі часта абмяжоўвалася аналізам вобразна-выяўленчых лексічных сродкаў. Семантыка-стылістычныя асаблівасці мовы пісьменнікаў заставаліся па-за ўвагай даследчыкаў, таму сёння навукова-запатрабаванымі з’яўляюцца распрацоўкі аднаго з самых складаных пытанняў сучаснага мовазнаўства – вывучэнне суб’ектыўнай мадальнасці мовы мастацкіх твораў і стылю пісьменнікаў на семантыка-сінтаксічным узроўні, што абумоўлена каштоўнасцю іх вынікаў. У нашай працы мы звяртаемся да вызначэння суб’ектыўнай мадальнасці мовы мележаўскіх твораў,да вызначэння дадатковых значэнняў, звязаных з перадачай адносін моўцы, да таго, што ён гаворыць.

**Мэта даследавання.** Вызначыць семантыка-стылістычныя асаблівасці выкарыстання чужой мовы ў творах І. Мележа; выявіць спосабы выражэння (суб’ектыўную мадальнасць) чужога маўлення ў “Палескай хроніцы” І. Мележа; вызначыць тэматычныя групы выражэння выказніка ў словах аўтара; вызначыць месца і акрэсліць ролю пісьменніка ў развіцці беларускай літаратурнай мовы.

**Аб’ект даследавання** – “Палеская хроніка” І. Мележа, **прадмет** даследавання – чужая мова.

**Выкарыстаныя методыкі**. Мэты і задачы працы абумовілі выбар метаду лінгвістычнага апісання ў якасці асноўнага.

**Навуковая навізна** і каштоўнасць вынікае з аналізу чужой мовы твора “Палеская хроніка” І. Мележа.

**Атрыманыя навуковыя вынікі.** Аналіз фактычнага матэрыялу паказвае, што ў “Палескай хроніцы” Івана Мележа выкарыстанне чужой мовы мае свае